## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

# Буду настаўнікам

З беларускай шчырай мовай
Ладзяць нашы галасы.
Эх, пяюцца самі словы:
— Бусел,
верасень,
лясы!



З Вольгай Паўлаўнай цікава.
Не злуецца, не крычыць.
Мы, як быццам для забавы,
Разам вучымся лічыць.

А бяжым на перапынак,
Чуюць хлопчыкі наказ:
— Паважайце вы дзяўчынак —
Будуць паважаць і вас!

Падрасту і ўсё згада́ю,
Вашых слоў мне не забыць:
— Дзеці, кожнаму жадаю
Чалавекам добрым быць!

У няшчасці друг далёкі,
Трапіў у бяду сусед, —
Не глядзі спакойна збоку,
Памажы яму як след!



Правообладатель Национальный институт образования



Адкрывае школа цуды
Мне і ўсім маім сябрам.
Калі-небудзь, можа, буду
Я настаўнікам і сам.

1. Дзякуючы каму дзеці палюбілі беларускую мову?
2. Як вы разумееце сэнс радкоў:

   З беларускай шчырай мовай
   Ладзяць нашы галасы?

3. Што кажа вучань пра характар сваёй настаўніцы Вольгі Паўлаўны? Прачытайце адпаведныя радкі.
4. Якія словы настаўніцы запомніў аўтар на ўсё сваё жыццё? Знайдзіце і прачытайце гэтыя словы. Ці спадабаліся яны вам? Чаму?
5. Якія ілюстрацыі можна зрабіць да верша? Апішыце іх словамі.
6. Вывучыце верш на памяць.

**Давайце абмяркуем.** Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрываюць школа і настаўнікі? Ці лёгка, на вашу думку, быць настаўнікам? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

***Му́ляр*** — рабочы, які будуе што-небудзь з каменю або цэглы.
***Мурава́ны*** — зроблены з каменю або цэглы.
***Рыштава́нне*** — часовае збудаванне з дошак, стоек або металічных трубак, якое ўстанаўліваецца ўздоўж сцен будынка для правядзення будаўнічых або рамонтных работ.

## ІВАН МУРАВЕЙКА

## Паўлік-будаўнік

Паўлікаў тата — будаўнік. Працуе мулярам — складае з цэглы будынкі. Амаль палавіна дамоў у іх вёсцы — мураваныя, і ўсе пабудаваў Паўлікаў тата са сваімі таварышамі.

Аднойчы тата сказаў Паўліку:

— Ты ўжо скончыў дзіцячы садзік і паступіў у школу, у першы клас. Калі станеш зусім-зусім дарослым, кім ты будзеш?

— Буду, як ты, будаўніком, — адразу ж адказаў Паўлік, бо гэта ён даўно ўжо вырашыў.

— Добра, — падтрымаў сыночка тата, — наша прафесія самая патрэбная на зямлі. Мая брыгада пачала будаваць новы магазін. Ты хацеў бы нам дапамагчы?

— Яшчэ як хацеў бы! — узрадаваўся Паўлік. — Але ж я нічога не ўмею.



Правообладатель Национальный институт образования

— Я цябе навучу...

Паўлік здагадаўся, што тата хоча ўзяць яго з сабой на будоўлю, і, каб ён не перадумаў, сказаў:

— Дык хадзем хутчэй.

На будоўлі Паўліка сустрэлі весела:

— У нашу брыгаду прыбыло папаўненне. Цяпер мы хутка закончым будаўніцтва.

Тата дапамог сыну ўзысці на рыштаванні, і яны пачалі працаваць.

— Бяры цагліну, — сказаў тата.

Паўлік узяў.

— Кладзі сюды на раствор.

І яшчэ адну цагліну паклаў Паўлік.

— А цяпер, сынок, бяжы дахаты, — сказаў тата. — Як закончыш першы клас — пакладзеш чатыры цагліны, другі клас — восем цаглін, трэці — шаснаццаць, чацвёрты — трыццаць дзве...





Правообладатель Национальный институт образования

— А як скончу школу, колькі цаглін я за дзень буду класці? — запытаў Паўлік.

— Тады ты будзеш сапраўдным будаўнікoм і пакладзеш столькі цаглін, колькі я цяпер кладу.

Паўлік злез з рыштаванняў і доўга глядзеў, як працуе яго тата.

Неяк, калі першакласнікі праходзілі ля будучага магазіна, Паўлік паказаў рукой на сярэдзіну сцяны:

— Вунь тыя дзве цагліны — мае!



1. Кім працаваў Паўлікаў тата? Што вы ўжо ведаеце пра гэту прафесію?
2. На якую тэму тата аднойчы гутарыў з сынам? Як гэта характарызуе бацьку?
3. З якой мэтай тата вырашыў запрасіць сына з сабой на працу?
4. Паразважайце, кім у будучым можа стаць Паўлік.
5. Які эпізод з апавядання праілюстраваны на с. 61? Прачытайце ўрывак, якому адпавядае малюнак.



Размяркуйце ролі і прачытайце апавяданне па асобах.

**Давайце абмяркуем.** Чаму прафесія будаўніка лічыцца адной з самых патрэбных на зямлі?



Правообладатель Национальный институт образования